# *РАЗДЕЛ 6*
# *СОВРЕМЕННАЯ БИБЛИОТЕКА: ИННОВАЦИОННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ – НОВЫЕ ВОЗМОЖНОСТИ*

## СПЕЦЫФІКА І АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ КУЛЬТУРНА-ДАСУГАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ДЗІЦЯЧЫХ БІБЛІЯТЭК

**Бігеза В. М.**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з важнейшых задач сучаснага грамадства з’яўляецца стварэнне ўмоў для эфектыўнай самарэалізацыі творчага патэнцыяла асобы, інтэлектуальнага і духоўнага прагрэса чалавека. Гэту задачу вырашае шэраг сацыяльных інстытутаў, у тым ліку і дзіцячыя бібліятэкі. Сёння навукоўцы вызначаюць дзіцячую бібліятэку і яе місію, як унікальную з’яву культуры, якая сумесна з сям’ёй і школай садзейнічае сацыяльнай адаптацыі дзяцей у грамадства. Місія дзіцячых бібліятэк у тым, каб выкарыстоўваючы свае рэсурсы, стварыць асяроддзе развіцця дзіцяці праз чытанне, кнігу і нетрадыцыйныя веды носьбітаў інфармацыі, якое адпавядае яго полаўзроставым, сацыякультурным і індывідуальным асаблівасцям.

Спецыфіка работы дзіцячых бібліятэк прасочваецца ў вырашэнні шэрагу задач, адносна растучага чалавека: гэта – развіццё і самаразвіццё дзіцяці праз далучэнне да чытання, да сусветнай і нацыянальнай культуры, прапаганда каштоўнасці чытання і кнігі, узаемаўзбагачэнне традыцыйнай кніжнай культуры і новай “электроннай”, выхаванне творчых здольнасцей, фарміраванне інфармацыйнай, экалагічнай культуры і інш. Значная колькасць названых задач вырашаецца ў працэсе арганізацыі і правядзення культурна-дасугавай дзейнасці дзіцячай бібліятэкі.

Спецыфіка КДД дзіцячых бібліятэк праяўляецца ў спецыфічных формах работы адносна чытачоў-дзяцей розных узроставых груп, і іх бацькоў, настаўнікаў, выхавацелей. Яна праяўляецца і ў тым, што разлічана і распаўсюджваецца не толькі на карыстальнікаў бібліятэкі (тых, хто фармальна ў яе запісаны). Звесткі аб правядзенні разнастайных культурна-дасугавых мерапрыемстваў могуць атрымаць настаўнікі, бацькі, дзеці розных узростаў праз сродкі масавай інфармацыі, водгукі знаёмых, рэкламную дзейнасць бібліятэкі. Наведванне бібліятэкі, чытанне ў чытальнай зале, самі дакументы, узятыя на абанеменце і чытаемыя дома ў вольны час, – усё гэта садзейнічае рэалізацыі культурна-дасугавай функцыі [1, с. 6].

Дасугавая функцыя бібліятэк нацэлена на абуджэнне і фарміраванне чытацкіх патрэбнасцей. Сёння спецыфіка дзіцячых бібліятэк праяўляецца праз актуалізацыю праблемы яе функцыяніравання менавіта як бібліятэкі Дзяцінства, якая павінна стаць для дзіцяці перш за ўсё прастораю яго

паўнацэннага духоўна-маральнага развіцця [2, с. 9].

Акрамя таго, спецыфікай работы дзіцячых бібліятэк з'яўляецца і тое, што дзеці – самая эканамічна і сацыяльна не абароненая частка насельніцтва, і дзіцячыя бібліятэкі павінны прадастаўляць ім як мага больш бясплатных паслуг, уводзячы плату толькі для арганізацый і, часткова, для дарослых.

Падкрэслім, што КДД дзіцячых бібліятэк здзяйсняецца ў адпаведнасці з Канвенцыяй ААН аб правах дзіцяці, у якой канстатуецца "права дзіцяці на адпачынак і культурна-дасугавую дзейнасць, права ўдзельнічаць у гульнях і гульневых мерапрыемствах, адпавядаючых узросту дзіцяці, і свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці" (арт. 31) [3].

Удасканальванне зместа і форм дасугавай дзейнасці павінна забяспечыць адпаведнасць гэтай дзейнасці духоўным патрэбнасцям дзяцей і ставіць сваёй мэтай павышэнне паўнаты і аператыўнасці задавальнення дасугавых запытаў, садзейнічанне міжасобасным зносінам ва ўмовах уласцівага бібліятэцы культурнага асяроддзя.

У наш час культурна-дасугавая дзейнасць дзіцячай бібліятэкі ў значнай ступені абгрунтавана такім працэсам як чытанне. Як вядома сусветная супольнасць сёння высока ацэньвае чытанне і "чытацкую граматнасць" (культуру чытання асобы): 2003–2012 гады аб'яўлены ААН дзесяцігоддзем граматнасці.

І сапраўды, прызначэнне дзіцячай бібліятэкі – далучыць дзіця да кнігі, якая закране струны яго душы, выхавае яго як асобу, як грамадзяніна, як добрага і прыстойнага чалавека, талерантнага да ўсіх.

Як вядома сучасныя дзеці страцілі навыкі удумлівага чытання, таму на дапамогу ім прыходзяць правераныя формы работы – гучныя чытанні, якія дапамагаюць дзецям зразумець і засвоіць тэкст.

На думку псіхолагаў зрокавае і слыхавое ўспрыняцце не адэкватна па сваім інфармацыйным магчымасцям, па сувязі з уяўленнем чалавека, яго эмоцыямі і мышленнем. Агучаны тэкст успрымаецца больш эмацыянальна, чытаемы – больш рацыянальна.

Акрамя таго, чытанне ўслых садзейнічае духоўным зносінам, якія маюць "дынамічны і выхаваўчы характар – менавіта выхаванне і самога сябе і адзін аднаго … Яно з'яўляецца натуральным асяроддзем для духоўнага росту" [4, с. 66].

Чытанне ўслых таксама садзейнічае ўзнікненню дыялога, абмеркавання, што з'яўляецца педагагічна значымай формай для развіцця дзіцяці.

На нашу думку, улічваючы той факт, што ў 2009 годзе ЮНЭСКА абвясціла беларускую мову сярод знікаючых моў, дзіцячым бібліятэкам нашай краіны мэтазгодна праводзіць гучныя чытанні на беларускай мове. Яны могуць праходзіць як дасугавыя мерапрыемствы для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў у бібліятэцы з прысутнасцю бацькоў, настаўнікаў, выхавацеляў, ці па-за межамі бібліятэкі. Пры гэтым могуць быць выкарыстаны разнастайныя жанры беларускай дзіцячай літаратуры, мультымедыйныя сродкі. Падкрэслім, што бібліятэкары павінны растлумачыць бацькам (на бацькоўскіх сходах,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сустрэчах, кансультацыях у бібліятэцы) значнасць менавіта гэтай формы сямейнага чытання. Дарэчы, у Германіі існуе Нацыянальная ініцыятыва сумесна са штотыднёвай газетай "Die Zeit" – "Мы чытаем услых – усюды і ў любы час". Чытанне ўслых было арганізавана ў дзіцячых садках, школах, бібліятэках, і іншых установах па ўсёй Германіі [5]. Заўважым, што і ў нас на кніжнай выставе ў г. Мінску (снежань, 2012 г.) паэты чыталі свае творы дзецям услых.

У кантэксце разглядаемай праблемы неабходна таксама адзначыць важнасць сумеснай Рэспубліканскай акцыі "Чытаем па-беларуску" прапанаванай і распачатай часопісамі "Бібліятэка прапануе" і "Бярозка" з верасня 2010 года. Асноўная мэта гэтай акцыі – захаванне цікавасці да беларускай кнігі, беларускай мовы сродкамі найперш бібліятэкі, сям'і, школы і іншых устаноў, маючых дачыненне да дзяцей. І тут у рамках арганізацыі і правядзення культурна-дасугавых мерапрыемстваў у бібліятэцы шырокае поле дзейнасці: запрашэнне на сустрэчы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, настаўнікаў, навукоўцаў-філолагаў, прадстаўнікоў выдавецтваў, сумеснае слуханне і чытанне твораў, арганізацыя літаратурных гульняў. Апошнія з'яўляюцца не толькі цікавай забавай для дзіцяці, але і будзяць яго ўяўленне, развіваюць лагічнае мысленне, дапамагаюць хуткай мабілізацыі інтэлектуальных здольнасцей, развіццю памяці. Пры гэтым бібліятэкарам неабходна ўдзяляць увагу павышэнню прэстыжу чытаючых дзяцей. З гэтай мэтай можна праводзіць беніфісы і вечары-партрэты лепшых чытачоў, падрыхтаваць відыёпрэзентацыю "Быць чытачом прэстыжна" і інш.

Асобна падкрэслім важнасць развіцця новых напрамкаў і форм папулярызацыі кніжнай культуры, уключаючы шырокую рэкамендацыю кніг і літаратурных падзей сродкамі электроннага асяроддзя. Сёння даследчыкі, разглядаючы магчымасці сайта дзіцячай бібліятэкі па рэкамендацыі лепшых узораў сусветнай мастацкай літаратуры, прыйшлі да высновы, што яны валодаюць шырокімі магчымасцямі далучэння дзяцей да чытання, у іх знаходзяць сваё адлюстраванне як традыцыйныя, так і інавацыйныя сродкі рэкамендацыі (СР) мастацкай літаратуры. Яны павінны скласці канкурэнцыю забаўляльным формам "электроннага выхавання", негатыўна ўплываючых на развіццё асобы [6, с. 41]. Прапановы па змястоўнаму ўдасканаленню сайтаў дзіцячых бібліятэк прыведзены аўтарам у папярэдніх публікацыях [7].

Акрамя таго, для арганізацыі дасуга дзяцей, бібліятэкі падрыхтавалі электронныя віктарыны, тэматычныя мультымедыйныя кампакт-дыскі, літаратурныя слайд-шоу.

Адзначым важнае значэнне пры арганізацыі і правядзенні культурна-дасугавай дзейнасці прафесійнага майстэрства, эрудыцыі, артыстычнасці бібліятэкараў, умення запрашаць на мерапрыемствы цікавых людзей, валодаць камунікатыўнымі, крэатыўнымі здольнасцямі. І, безумоўна, веды і ўменні бібліятэкара пры правядзенні культурна-дасугавай дзейнасці павінны быць выстраены на педагагічных і псіхалагічных канцэпцыях сацыяльнай педагогікі і сацыяльнай псіхалогіі, маючых маральную аснову і гуманістычную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

накіраванасць. Падкрэслім, што прывабнасць культурна-дасугавых мерапрыемстваў для дзяцей у значнай ступені залежыць ад фантазіі, ініцыятывы і інтузіязма бібліятэкараў, працуючых з дзецьмі.

У працэсе культурна-дасугавай дзейнасці з дзецьмі бібліятэкарам ставіцца мэта выхавання духоўнасці і развіцця творчых здольнасцей мноствам сродкаў, сярод якіх, напрыклад, далучэнне да народнай культуры. Адным з кірункаў дзейнасці дзіцячых бібліятэк у гэтым аспекце з’яўляецца звяртанне да нацыянальна-культурных традыцый, што, безумоўна, аказвае ўплыў на фарміраванне і развіццё духоўнага свету дзіцяці, бо “найважнейшым момантам выхавання ў любым узросце з’яўляецца далучэнне да духу і культуры свайго народу” [8].

Дзеці, прымаючы ўдзел у разнастайных мерапрыемствах бібліятэкі, усё больш разумеюць як важна ў сучасным сусвеце ведаць гісторыю сваёй краіны, традыцыі духоўнага жыцця нашага народа, розныя віды яго мастацкай творчасці. Бібліятэчны персанал дзіцячых бібліятэк краіны стварае і выкарыстоўвае мэтавыя мастацка-адукацыйныя праграмы, заснаваныя на нацыянальных традыцыях, этнаграфічныя электронныя БД сваіх мясцін, якія памагаюць дзецям зразумець як важна даражыць духоўнымі каштоўнасцямі мінулага, захоўваць іх.

Пры правядзенні культурна-дасугавых мерапрыемстваў дзіцячыя бібліятэкі краіны значную ўвагу надаюць экалагічнай асвеце і выхаванню экалагічнай культуры. Бібліятэчным персаналам былі створаны і рэалізоўваліся комплексныя праграмы экалагічнага зместу, бібліятэкі ўдзельнічалі ў конкурсах, акцыях, тыднях, дэкадах экалогіі, пры іх працавалі клубы экалагічнай накіраванасці. У мерапрыемствах бібліятэк прымалі ўдзел інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, таварыствы аховы прыроды, музеі прыроды і экалогіі.

Вышэйназваны кірунак культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк цесна звязаны з краязнаўствам. Бібліятэкі краіны рэалізуюць доўгатэрміновыя праграмы па краязнаўстве, якія прадугледжваюць вывучэнне гісторыі краю, звычаяў і традыцый продкаў, садзейнічаюць духоўнаму выхаванню карыстальнікаў бібліятэкі. Дзеці прымаюць удзел у працы краязнаўчых гурткоў, клубаў, збіраюць мясцовы матэрыял, рэчы даўніны і арганізаваць цыклы выстаў розных экспанатаў, удзельнічаюць у краязнаўчых падарожжах, месячніках краязнаўчай літаратуры, гульнях-вандроўках, уроках краязнаўства. З імі праводзяцца гутаркі, віктарыны, конкурсы, электронныя прэзентацыі, запрашаюцца на сустрэчы народныя ўмельцы.

Належная ўвага пры правядзенні культурна-дасугавай дзейнасці надаецца працы з сям’ёй. Бібліятэка праводзіць сямейныя святы, вечарыны, дні сямейнага адпачынку, конкурсы творчых работ, літаратурныя ранішнікі, круглыя сталы. Мы мяркуем, што цікавым і карысным мерапрыемствам для бацькоў было б правядзенне літаратурнай гасцёўні “Дзіцячае чытанне як патэнцыял духоўнага развіцця грамадства”.

Праводзячы культурна-дасугавыя мерапрыемствы, бібліятэкі надаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вялікую ўвагу выхаванні дабрыні і міласэрнасці, распрацоўваючы доўгатэрміновыя праграмы для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароў’я, праводзяць Дні сацыяльнай дапамогі, гутаркі, віктарыны, гульні і конкурсы. Усё гэта дапамагае дзецям адаптавацца ў бібліятэчнай прасторы, аказвае станоўчы ўплыў на іх эмацыянальны стан.

Аб поспехах дзіцячых бібліятэк Беларусі ў выхаваўчай рабоце з падрастаючым пакаленнем, сведчаць першая і другая прэмія рэспубліканскага конкурса “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры” за 2010 год (дзіцячая бібліятэка № 4 ЦСДБ г. Мінска і Рэчыцкая гарадская дзіцячая бібліятэка імя А.П. Гайдара).

Разам з тым, на наш погляд, удасканаленню разглядаемых напрамкаў культурна-дасугавай дзейнасці магло б садзейнічаць больш цеснае супрацоўніцтва дзіцячых бібліятэк са школьнымі, публічнымі бібліятэкамі, правядзенне круглых сталоў, семінараў па азначанай тэматыцы, а таксама рэгулярнага маніторынгу для вывучэння аб’ектыўнай карціны чытацкіх інтарэсаў дзяцей. Мэтазгодна сістэматычна знаёміць школьнікаў з новымі фарматамі чытання і ўспрыняцця мастацкага тэксту: кніга ў лічбавым асяроддзі; вэбліяграфія, тэксты, заснаваныя на сеткавым узаемадзеянні і інш.

Такім чынам, на падставе вышэйадзначанага можна канстатаваць, што культурна-дасугавая дзейнасць застаецца актуальным кірункам работы дзіцячых бібліятэк, бо яе напрамкі, формы і змест у значнай ступені садзейнічаюць фарміраванню маральна-духоўнай прасторы, якая забяспечвае гарманічнае развіццё асобы дзіцяці, яго творчую самарэалізацыю, перавагу гуманістычных каштоўнасцей.

---

1. *Олзоева, Г.К.* Массовая работа библиотек / Г.К. Олзоева. – М. : Либерия – Бибинформ. – 2006. – 120 с.

2. *Голубева, Н.Л.* “Окно в вечно живой мир детства”. К вопросу об информационном пространстве детской библиотеки / Н.Л. Голубева // Библиотечное дело. – 2011. – № 2. – С. 8-10.

3. *Конвенция ООН* о правах ребенка // Организация Объединенных Наций [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа: http: //www.un.org./Russian/documen/convents/childcon/htm/. – Дата доступа: 22.11.2012.

4. *Арсеньев, Н.С.* Из русской культурной и творческой традиции / Н.С. Арсеньев. – Лондон: Overseas Publication Interchange Ltd., 1992. – 301 с.

5. *Bibliothek:* forschlung und praxis. – 2009. – № 3. – S. 153-169.

6. *Потехина, Ю.В.* Возможности сайта детской библиотеки по рекомендации лучших образцов мировой художественной литературы / Ю.В. Потехина // Библиотековедение. – 2010. – № 4. – С. 38-42.

7. *Бігеза, В.М.* Web-сайты як састаўная частка электронных рэсурсаў дзіцячых бібліятэк / В.М. Бігеза // Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 21-22 кастр. 2009. – Мінск: БДУКМ, 2010. – С. 79-84.

8. *Шадриков, В.Д.* Способности человека / В.Д. Шадриков. – Воронеж, 1997. – 285 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ